Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 28 (240) | Субота, 10 снежня 1955 года. | Цана 20 кап.

## ВЫШЭЙ УЗРОВЕНЬ КУЛЬТУРНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ

У шматбаковай падрыхтоўцы совецкага сп… выключна важнае значэнне належыць культурн… рабоце. Яе задачы заключаюцца ва ўкараненні ко… най маралі і эстэтычным выхаванні. Формы яе н… рознастайныя і дазваляюць арганізаваць цікавы, з… і рознастайны адпачынак усіх студэнтаў і работні… версітэта.

Самае шырокае распаўсюджанне павінны знайсці такія формы культурна-масавай работы, як вечары і карнавалы, тэарэтычныя канферэнцыі і лекторыі, дыспуты і культпаходы, канцэрты самадзейнасці і канферэнцыі чытачоў, конкурсы на лепшага дэкламатара, вакаліста, танцора, сустрэчы з наватарамі вытворчасці, пісьменнікамі, вучонымі, артыстамі і г. д.

Некаторая работа ў гэтых адносінах у нас вядзецца. Працуе самадзейнасць агульнауніверсітэцкая і на факультэтах, арганізоўваюцца культпаходы і вечары, рэгулярна ў клубе універсітэта дэманструюцца кінофільмы. Але ўсё гэта, нажаль, у больш чым сціплых маштабах, і формах, далёка недасканалых.

Самадзейнасць, асабліва факультэцкая, у сваім рэпертуары мае нумары, нізкія па свайму ідэйнаму ўзроўню. Так, напрыклад, на студэнцкім вечары біялагічнага і філалагічнага факультэтаў выступіў студэнт А. Герус з чытаннем «уласнага твора», які аказаўся паклёпам на нашу сапраўднасць.

Трэба палепшыць работу мастацкага совета пры клубе універсітэта і паставіць пад яго кантроль якасць факультэцкай самадзейнасці.

Трэба правільна арганізаваць дэманстрацыю кінофільмаў. Нядаўна ў нас дэманстраваліся французскія кінофільмы—«Тэрэза Ракэн», па аднайменнаму раману Э. Заля, і «Чырвонае і чорнае» па Стэндалю. Гэта справа добрая. Але, мяркуючы па рэакцыі гледачоў, многія з іх не зразумелі сапраўднага сэнсу фільмаў, не ўбачылі вялікага майстэрства ў стварэнні артыстамі вобразаў герояў, не дайшло да многіх і соцыяльнае гучанне твораў французскай кінематаграфіі. Зусім іншае ўражанне было-б у гледача, калі-б перад пачаткам дэманстрацыі такіх фільмаў арганізаваць кароткія (хвілін на 20—30) іх каментарыі выкладчыкамі або найбольш падрыхтаванымі студэнтамі.

Каментыраваць неабходна і нашы, совецкія кінофільмы, фільмы краін народнай дэмакратыі, прыцягваючы да гэтай работы адпаведныя кафедры.

Незаслужана аддалены забыццю нашы «старыя», даваенныя і ваеннага часу фільмы; такія, як трылогія аб большэвіку Максіме, маюць выключна важнае выхаваўчае значэнне. Трэба вярнуць іх на экран у нашым універсітэце. Гэта асабліва патрэбна нам таму, што нашы студэнты—моладзь, якая нарадзілася значна пазней Кастрычніка, разам са з'яўленнем на экранах гэтых кінофільмаў, а фільмы ваеннага часу многія нашы студэнты не маглі бачыць з-за асобых прычын.

Карысна было-б многія публічныя лекцыі, якія чытаюцца ў нас на факультэтах, падмацаваць затым адпаведнымі кінофільмамі. Напрыклад, пасля лекцыі аб рэволюцыі 1905 года паказаць кінофільмы «Броненосец Пацёмкін». Кіно—адзін з найважнейшых відаў мастацтваў, і яго трэба правільна выкарыстоўваць.

Трэба арганізоўваць вечары на факультэтах і курсах, асабліва тэматычныя. Цікава і карысна было-б правесці гутаркі на тэмы: «Аб культуры паводзін», «У чалавеку ўсё павінна быць прыгожа», «Аб маральным абліччы совецкага студэнта», сустрэчы студэнтаў старэйшых курсаў з малодшымі, літаратурныя віктарыны і г. д.

Вялікае выхаваўчае значэнне мае калектыўнае наведванне тэатраў і кіно з абавязковым абмеркаваннем фільма або спектакля.

Вельмі мала ў нас праводзіцца канферэнцый чытачоў. Такія канферэнцыі—па асобных літаратурных творах або тэмах—развіваюць эстэтычны густ, вучаць правільна разумець і ацэньваць мастацкія творы. Для канферэнцый чытачоў можна было-б рэкамендаваць многія тэмы, звязаныя з гісторыяй грамадзянскай і Айчыннай войнаў, будаўніцтвам соцыялізма і комунізма. Такім вечарам можна надаць і прафесіянальны ўхіл і г. д.

Разгортванне культурна-масавай работы з ахопам усяго калектыва студэнтаў і работнікаў універсітэта—справа партыйных, комсамольскіх і профсаюзных арганізацый. Гэта—ганаровы абавязак усяго прафссарска-выкладчыцкага складу.

**Ф. БАРАВІК,**
член парткома БДУ.



*На практычных занятках па біяхіміі раслін. (Справа налева) Зіна Тарасевіч, Ліда Бяляева, Света Чарнаусава і кандыдат біялагічных навук Наталля Сцяпанаўна Суднік.*

# ПА НАШАМУ УНІВЕРСІТЭТУ

★ ★ ★

## СУСТРЭЧА СТУДЭНТАЎ З АРТЫСТАМІ

Днямі адбылася сустрэча студэнтаў 4 і 5 курсаў аддзялення журналістыкі з артыстамі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, на якой быў абмеркаваны спектакль «У добры час» па п'есе В. Розава.

Выступаючыя А. Вярцінскі, Я. Крыскавец, Н. Адамчык і іншыя адзначылі, што спектакль у асноўным з'яўляецца творчай удачай калектыва артыстаў.

Побач з гэтым было ўказана на шэраг недахопаў: дрэннае мастацкае афармленне, няправільнае вымаўленне беларускіх слоў некаторымі артыстамі.

З адказным словам выступілі артысты Ю. Галкін, Л. Драздова, В. Кудрэвіч, Б. Дакальская, М. Лапідус, З. Браварская, Б. Уладамірскі, якія згадзіліся з адзначанымі недахопамі і абавязаліся іх выправіць.

— Сустрэча з вамі прынесла нам многа карысці,—сказаў у заключэнне П. Малчанаў.—Мы пастараемся, каб падобныя абмеркаванні спектакляў са студэнтамі аддзялення журналістыкі наладжваліся значна часцей.

**В. ВІШАНКІН.**

## НАША МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

На біялагічным факультэце аб'яўлен конкурс на лепшы факультэцкі вечар. Удзельнічаць у ім будуць усе курсы.

На факультэце створан хор, якім кіруе Бэла Вінаградава. Ён ужо выконвае такія папулярныя песні, як «Зязюлька», «Маскоўскія агні».

Драмкалектыў рыхтуе п'есу А. П. Чэхава «Вяселле». Распачаў сваю работу і танцавальны калектыў, якім кіруе студэнтка III курса аддзялення біялогіі Смірнова.

**В. ШАЛАТОНІН,**
студэнт I курса біяфака.

## ВЕЧАР, ПРЫСВЕЧАНЫ ДНЮ КАНСТЫТУЦЫІ

Адбыўся вечар студэнтаў універсітэта, прысвечаны знамянальнай даце—Дню Совецкай Канстытуцыі. Даклад аб значэнні Совецкай Канстытуцыі зрабіў дацэнт В. А. Дарогін. Пасля . даклада быў дадзен канцэрт мастацкай самадзейнасці сіламі студэнтаў універсітэта

Былі выкананы песні совецкіх кампазітараў. З поспехам выступіла група маладых вакалістаў, якая выканала «Песню французскага салдата».

Урывак з рамана М. Шолахава «Яны змагаліся за Радзіму» прачытаў студэнт Г. Герасіменка.

**Я. ГОМАН.**

## Да месячніка германа-совецкай дружбы

Ва універсітэце адбыўся вечар, прысвечаны месячніку германа-совецкай дружбы.

З інфармацыйным дакладам «Нямецкая навуковая літаратура ў фондах бібліятэкі універсітэта» выступіла старшы бібліятэкар О. Л. Ніканава. Яна расказала, што ў бібліятэцы універсітэта знаходзіцца багатая даведачная і навуковая літаратура нямецкіх вучоных па шматлікіх пытаннях фізікі, хіміі, медыцыны, біялогіі і г. д. Вучоныя універсітэта—прафесары Вінберг, Лукашоў, Паўлючэнка, Старобінец, кандыдат хімічных навук Свірыдаў і іншыя знаёмяцца з дасягненнямі замежных даследчыкаў. Дакладчыца таксама паведаміла, што ў бібліятэку рэгулярна паступаюць Вучоныя запіскі з Берлінскага і Галенскага універсітэтаў і Патсдамскага педагагічнага інстытута. З Растокскага універсітэта ў апошні час атрыманы серыі зборнікаў, прысвечаных навуковым светапоглядам К. Маркса, Ф. Энгельса і гісторыі заснавання комуністычнай партыі Германіі.

Прысутнымі былі выказаны пажаданні, каб выпускаемы бібліятэкай інфармацыйны бюлетэнь даваў разгорнутую даведку аб паступіўшых выданнях замежнай літаратуры, каб гэтая літаратура шырэй выкарыстоўвалася нашымі лабараторыямі, кафедрамі замежных моў, студэнцкімі навукова-даследчымі гурткамі.

З кароткім дакладам аб дасягненнях нямецкай мастацкай літаратуры выступіў дацэнт Д. Е. Фактаровіч.

У заключэнне студэнты Мацкевіч, Канонік, Ляшкевіч і Лебедзева прачыталі на нямецкай мове вершы Бехера, Вайнерта і Брэхта.

**І. КІРЫЛАЎ.**

## Мы з гонарам выканаем Ваш наказ

Дарагія сябры!

З вялікай радасцю прачыталі мы Ваша пісьмо. І як радасна стала на душы ў кожнага з нас, калі даведаліся, што Вы выслалі нам літаратуру. Мы шчаслівыя тым, што аб нас клапоцяцца нашы землякі-беларусы.

Сябры! Наш соўгас размешчан у 130 кілометрах ад чыгункі. Спачатку, як і ва ўсякай новай справе, нам давялося зазнаць нямала вялікіх цяжкасцей. Прыходзілася размяшчацца ў халодных вагончыках і палатках, непадрыхтаваных да зімы, у маленькіх пакойчыках мясцовага насельніцтва. Таксама ў пачатку веснавых палявых работ у нашым соўгасе востра адчувалася нястача тэхнікі і сельскагаспадарчага інвентару, з-за чаго прышлося з вялікім спазненнем выехаць на палявыя работы. І ўсё-ткі наш соўгас план веснавой сяўбы выканаў на 100 працэнтаў, гэтаму вельмі дапамагла добрая праца нашай моладзі і комсамольцаў.

Першую баразну на цаліне праклаў былы фармаўшчык завода імя Кірава г. Мінска, трактарыст Іван Куляшоў. Ён з кожным днём набываў вопыт і сваёй працай натхняў астатніх. Яго прыкладу наследавалі і астатнія таварышы гэтай брыгады. Яны ўсе сталі штодзённа перавыконваць нормы выпрацоўкі за змену і сваімі паказчыкамі вывялі сваю трактарную брыгаду на першае месца.

Выдатна працавалі і рабочыя агароднай брыгады, якая складаецца з дзяўчат. Яны вырасцілі добры ўраджай гародніх культур. Прыклад у працы паказваюць Марыя Макарава, Соф'я Спарыш, Галіна Александровіч і многія іншыя.

Набыўшы вопыт у сельскагаспадарчых работах на веснавой сяўбе, соўгас датэрмінова выканаў план узняцця цаліны пад ураджай 1956 года. Пры норме 15000 гектараў соўгас узняў 16000 гектараў цаліны.

Цяпер перад намі стаіць найважнейшая і галоўная задача—забяспечыць сябе жылымі дамамі і памяшканнямі для жывёлы. За вырашэнне гэтых задач горача ўзяліся моладзь і комсамольцы соўгаса. Сіламі будаўнікоў і механізатараў пабудавана 9 чатырохкватэрных дамоў, 5 саманных чатырохкватэрных дамоў, магазін, сталовая, два інтэрнаты, пякарня, лазня. Арганізоўваюцца маладзёжныя нядзельнікі па абсталяванню клуба, ёсць спортпляцоўка і валейбольнае поле.

Наша комсамольская арганізацыя складаецца з 120 комсамольцаў, і ўсе яны прымаюць актыўны ўдзел у рабоце, ва ўсім дапамагаюць дырэкцыі соўгаса. Моладзь у нашым соўгасе выдатная; зараз яна дабіваецца хутчэйшага завяршэння будаўніцтва ў гэтым годзе.

Дарагія сябры! Дзякуем Вам за аказаную нам дапамогу ў літаратуры, за Вашу ўвагу да нас.

Няма сумнення, што з гэтага часу мы з Вамі будзем мець дружную рэгулярную перапіску.

Ад усяе душы жадаем выдатных поспехаў у вучобе, выпускнікам—выдатных поспехаў у выбранай прафесіі.

**Ад імя комсамольскай арганізацыі зернесоўгаса «Мытыкульскі» — сакратар комсамольскай арганізацыі Ю. ЛЕШАКОЎ.**

## ЛЕПШЫЯ ПАКОІ АТРЫМАЛІ ПРЫЗЫ

У інтэрнаце універсітэта па Бабруйскай вуліцы (корпус «А») у кутку адпачынку старастам лепшых пакояў былі ўручаны каштоўныя прызы.

Патэфон з камплектам пласцінак атрымаў староста 38 пакоя, які заняў першае месца па конкурсу. Другія пакоі атрымалі гітары, люстры, шахматы, шашкі.

**Я. ВЕРАС.**

Парады выкладчыка

# Творча вывучаць палітычную эканомію

Марксісцка-ленінская палітычная эканомія займае выключна важнае месца ў сістэме падрыхтоўкі совецкіх спецыялістаў для ўсіх галін народнай гаспадаркі і культуры. Яна ўзбройвае іх веданнем аб'ектыўных законаў грамадскага развіцця і ўменнем карыстацца імі ў справе пабудовы комуністычнага грамадства ў нашай краіне.

Як марксізм-ленінізм у цэлым, марксісцка-ленінская палітычная эканомія з'яўляецца не догмай, а кіраўніцтвам к дзеянню. Марксізм-ленінізм — вораг дагматызма, ён не прызнае нязменных вывадаў і формул, абавязковых для ўсіх эпох і перыядаў. Асобныя палажэнні і вывады марксізма, якія ўжо ўстарэлі, не могуць не замяняцца новымі палажэннямі і вывадамі, што адпавядаюць новым гістарычным умовам.

Класічным узорам замены ўстарэлых палажэнняў і вывадаў марксізма з'яўляецца новая закончаная тэорыя соцыялістычнай рэволюцыі, створаная В. І. Леніным на аснове глыбокага марксісцкага аналізу імперыялістычнай стадыі ў развіцці капіталізма. Ленінская тэорыя аб магчымасці перамогі соцыялізма першапачаткова ў некалькіх і нават у адной, асобна ўзятай краіне, ідэйна ўзброіла рабочы клас і яго партыю на пераможную барацьбу за знішчэнне капіталізма і стварэнне новага соцыялістычнага грамадскага ладу.

«Мы вывучаем марксізм-ленінізм,—гаварыў М. І. Калінін, — не для таго, каб ведаць яго фармальна, як раней вывучалі катэхізіс. Мы вывучаем марксізм-ленінізм, як метад, як інструмент, пры дапамозе якога мы правільна вызначаем нашы палітычныя, грамадскія і асабістыя паводзіны. Мы лічым, што гэта самая магутная зброя чалавека ў яго практычным жыцці».

Аднак у падыходзе да вывучэння марксісцка-ленінскай эканамічнай тэорыі яшчэ не ліквідаван дагматызм і начотніцтва. Гэта праяўляецца ў тлумачэннях тэарэтычных палажэнняў і вывадаў палітычнай эканоміі ў адрыве ад канкрэтна-гістарычнай абстаноўкі, у механічным іх завучванні і няўменні прымяняць іх на практыцы, у жыцці. Сувязь тэорыі з практыкай, іх адзінства—неабходная ўмова для авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Пры вывучэнні палітэканоміі соцыялізма вельмі важна зразумець, як аб'ектыўныя эканамічныя законы соцыялізма пазнаюцца і ўмела выкарыстоўваюцца Комуністычнай партыяй і совецкай дзяржавай у іх шматграннай дзейнасці па кіраўніцтву народнай гаспадаркай.

Рашэнні вераснёўскага, лютаўска-сакавіцкага, студзеньскага і ліпеньскага Пленумаў ЦК КПСС паказваюць, як наша партыя будуе сваю палітыку ў адпаведнасці з эканамічнымі законамі соцыялізма, як яна выкарыстоўвае гэтыя законы ў інтарэсах грамадства, як у яе дзейнасці арганічна спалучаецца тэорыя з практыкай.

Адрыў тэорыі ад практыкі цягне за сабой адмоўныя вынікі. Гэта можна бачыць, у прыватнасці, на наступным прыкладзе. Вядома, што да апошняга часу некаторыя совецкія эканамісты лічылі, што ў соцыялістычным грамадстве няма маральнага зносу тэхнікі, што пры соцыялізме існуе быццам толькі фізічны знос абсталявання. Прычым гэта выдавалася імі за адну з пераваг соцыялістычнай сістэмы гаспадаркі.

Падобны погляд на маральны знос тэхнікі пры соцыялізме нанёс значную шкоду справе тэхнічнага прагрэсу ў нашай краіне, паколькі ён, па сутнасці, апраўдваў коснасць і кансерватызм у развіцці тэхнічнай думкі.

Марксісцка-ленінская палітэканомія, якая раскрывае заканамернасці непазбежнай гібелі капіталізма і перамогі комунізма, не можа не выклікаць да сябе нянавісці з боку буржуазіі і яе ідэолагаў.

Таму важнейшай задачай як выкладання, так і вывучэння палітэканоміі з'яўляецца вострая крытыка і выкрыццё ўсіх варожых марксізму-ленінізму тэорый.

У нашай краіне эксплуататарскія класы даўно разбіты і ліквідаваны, але яшчэ захаваліся перажыткі буржуазнай ідэалогіі. Аб гэтым сведчаць варожыя марксізму-ленінізму погляды асобных эканамістаў па пытанню аб суадносінах цяжкай і лёгкай прамысловасці. Мерапрыемствы партыі і ўрада па крутому ўздыму сельскай гаспадаркі і расшырэнню вытворчасці тавараў народнага ўжытку яны тлумачылі як адмову ад устаноўкі на фарсіраванае развіццё цяжкой прамысловасці, адмаўлялі неабходнасць пераважнага росту вытворчасці сродкаў вытворчасці. Наша партыя асудзіла сцвярджэнні гэтых гора-тэарэтыкаў як негрунтоўныя і шкодныя для справы комуністычнага будаўніцтва.

Каб авалодаць палітычнай эканоміяй, студэнтам неабходна ўпорна і сістэматычна працаваць над вывучэннем твораў класікаў марксізма-ленінізма.

Абавязак выкладчыкаў палітэканоміі заключаецца ў тым, каб зацікавіць студэнтаў сваім прадметам, дапамагаць ім разумець выкладаемы матэрыял, а не механічна завучваць асобныя палажэнні і фармуліроўкі, прывучыць студэнтаў самастойна і настойліва працаваць над вывучэннем твораў Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна.

**Т. БАЗЫЛЕЎ,**
**заг. кафедрай палітэканоміі.**

## ТРАДЫЦЫЙНАЯ СУСТРЭЧА

Слаўныя літаратурныя традыцыі мае БДУ імя В. І. Леніна. У яго сценах у свой час вучыліся беларускія паэты К. Крапіва, П. Броўка, П. Глебка, П. Трус, А. Якімовіч і іншыя. Маладыя пісьменнікі А. Васілевіч, І. Мележ, М. Гамолка таксама атрымалі адукацыю ў нашым універсітэце.

Як і некалькі год назад, у літаратурным гуртку (кіраўнік кандыдат філалагічных навук І. Я. Науменка) праходзяць цікавыя вечары, на якіх абмяркоўваюцца творы пачынаючых паэтаў і пісьменнікаў.

Гуртkоўцы трымаюць цесную сувязь з пісьменніцкім асяроддзем сталіцы. Па ініцыятыве літаратурнага гуртка ў універсітэце адбылася канферэнцыя, прысвечаная традыцыйнай сустрэчы чытачоў з супрацоўнікамі часопіса «Маладосць».

Ва ўступным слове рэдактар часопіса Аляксей Кулакоўскі расказаў аб рабоце рэдакцыі, аб задачах часопіса ў справе выхавання совецкай моладзі.

Выступіўшыя студэнты Вярцінскі, Барадулін, Пільшчыкаў, Клышко, Слагада, Яскевіч і іншыя зрабілі рад каштоўных заўваг у адрас часопіса, выказалі пажаданні.

Паэты М. Танк, М. Лужанін, Я Брыль, М. Аўрамчык, А. Вольскі прачыталі свае новыя вершы, далі адказы на шматлікія пытанні прысутных і падзяліліся сваімі творчымі планамі.

**І. ЦІШЧАНКА.**

*ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ*

## Пажаданне студэнтаў

Кінофільмы ў гэтым годзе даволі часта дэманструюцца ў універсітэцкім клубе. Тэматыка іх самая разнастайная.

Ад многіх студэнтаў часта можна пачуць такое пажаданне: «Добра было-б, каб перад дэманстрацыяй фільма праводзіліся гутаркі, каментарыі да фільма. На гэтых гутарках можна было-б расказаць студэнтам, наколькі ён адпавядае гістарычнай рэальнасці, паказаць розніцу паміж творам, па якому зроблен фільм, і фільмам, наколькі апошні выпраўляе памылкі аўтара і г. д.

Такія кароткія, на 5 — 10 мінут, каментарыі да фільмаў будуць карыснымі не толькі для студэнтаў філфака, а і для ўсіх студэнтаў універсітэта. Гэта дапаможа глыбей зразумець ідэю фільма, яго вартасці.

**В. ЗАРЭЦКІ,**
**студэнт філалагічнага факультэта.**

# Яе паважаюць на курсе

Студэнты II курса аддзялення біялогіі працавалі непадалёк ад калгаснай сядзібы. Напэўна і сёння працоўны дзень закончыўся-б у сем гадзін вечара, калі-б не дождж, які прымусіў забегчы студэнтаў у чырвоны куток, што на ўскраіне жывёлагадоўчага двара.



Сюды, нібы па загаду, сабраліся ўсе, хто працаваў непадалёк. Тут і брыгадзір першай паляводчай брыгады калгаса імя Дзержынскага, і намеснік сакратара факультэцкага комсамольскага бюро. Лідзія Хадарэнка, і іншыя. Апошняй прыбегла Мая Сяляева, жвавая вясёлая дзяўчына з адкрытым выразам твару. Яна прынесла навіны з пятай паляводчай брыгады.

— Нас тут трынаццаць чалавек,—сказала Мая. — Можна правесці «лятучку», падагуліць вынікі работы за сямідзёнку.

— А потым выпусцім «баявы лісток»,—уставіла Лідзія Хадарэнка.

— Абавязкова!

Студэнты адразу адчулі, што Сяляева хоча паведаміць нейкія важныя факты.

— Я толькі што прышла з пятай брыгады. Там нашы аднакурсніцы выходзяць на работу ў 9 гадзін, а мы ў 10. Вось чаму вынікі ў іх лепшыя. У нашай-жа групе многія лодырнічаюць. Чаму, напрыклад, Курцар учора не вышла на работу? Усё хварэе?

Студэнтка спрабавала апраўдвацца, але дарэмна.

...З калгаса студэнтаў праводзіла мясцовая моладзь.

— Прыязджайце часцей да нас! Будзеце жаданымі гасцямі! Святочны нумар газеты трэба добра аформіць!

— Абавязкова прыедзем,— адказала за ўсіх Сяляева.

... Справаздачна - выбарчы сход прайшоў бурна. Студэнты актыўна абмяркоўвалі работу курсавога бюро. І пра што-б ні гаварылі, усе адзначалі, што работа групы на належным узроўні. У склад новага бюро адным з першых было названа прозвішча Маі Сяляевай.

— Зноў выбралі групоргам,—скардзілася, жартуючы, Мая, а сама думала: «Цяпер буду працаваць яшчэ лепш».

На апошнім перапынку Мая затрымала Аню Сасноўскую і сказала:

— Заўтра ў 9 гадзін зайдзі ў камітэт комсамола.

У Ані аж закалацілася сэрца.

«Заўтра? У камітэт?! Навошта? Напэўна, што комсамольскага даручэння не выканала на летніх канікулах!»

Гэтая думка вельмі ўсхвалявала дзяўчыну.

Але сакратар камітэта сустрэў яе вельмі ветліва. Хваляванне, як рукой зняло. Сакратар паведаміў, што яна будзе працаваць агітатарам на «Аўтапрамбудзе».

Дамоў Аня ішла праз сквэрык, што каля інстытута Народнай гаспадаркі. Надвор'е было добрае. Па алеях гуляла моладзь. Відаць, студэнты. «Вось ідзе Барыс Янушаў!.. Дык тут і аднакурснікі! Не, я нікуды не пайду. Буду рыхтаваць даклад, а паслязаўтра пакажу Маі. Яна за мяне непакоіцца».

Мая Сяляева працуе групоргам другі год. За гэты час яе палюбілі студэнты, як свайго лепшага сябра. З яе дапамогай курс стаў дружным, згуртаваным калектывам.

Любіць Мая Сяляева прайсці па пакоях інтэрната, пагутарыць са студэнтамі, распытаць пра жыццё іх бацькоў, пра калгас...

Добра, цікава працаваць у такой групе, дзе кожны студэнт бачыць перад сабой вялікую мэту.

...Экскурсіі на прадпрыемствы горада, культпаходы і дыспуты па кнігах, грунтоўныя адказы на семінарах, — вось чым жывуць студэнты II курса аддзялення біялогіі. Цяпер яны рыхтуюцца да дыспуту па п'есе В. Розава «У добры час».

Уперадзе вялікія справы. А колькі іх!...

**Б. УЛЬЯНКА.**

# Ці так трэба абараняць гонар факультэта?

28 лістапада студэнты III курса біёлага-глебавага факультэта сарвалі семінарскія заняткі па дарвінізму. За хвіліну да пачатку заняткаў дэлегаты курса тт. Белахвост, Малалетава з'явіліся ў дэканат папярэдзіць выкладчыка, што ўся група была ў тэатры і таму не падрыхтавалася да семінарскіх заняткаў. Гэта ўжо трэці па ліку зрыў заняткаў. Калі ў мінулым годзе студэнты глебавага аддзялення праявілі працавітасць, сістэматычна і ўпорна працуючы, паспяхова пераадольвалі ўсе цяжкасці, то ў бягучым годзе на III курсе становішча рэзка пагоршылася. Прычына гэтага — сур'ёзнае падзенне працоўнай дысцыпліны сярод студэнтаў. Іменна таму з запланаваных семінарскіх заняткаў давялося правесці толькі тры. Ды і на гэтых занятках студэнты не былі дастаткова актыўнымі, бо большасць з іх негрунтоўна і няўважліва чытала кнігі класікаў біялогіі.

Праведзеныя перад лекцыямі хвілінныя апытанні паказалі, што матэрыял папярэдніх лекцый студэнтамі зусім не прачытваецца, нягледзячы на тое, што студэнты былі папярэджаны не толькі аб неабходнасці праглядаць гэты матэрыял, але і аб самім факце апытанняў. Справа дайшла да таго, што некаторыя студэнты (як, напрыклад, Голуб) у час лекцый па дарвінізму апрацоўваюць вынікі лабараторных заняткаў па глебазнаўству, хаця ведаюць, што вывучаць дарвінізм можна толькі па лекцыях — падручнікаў і дапаможнікаў па гэтаму курсу няма. Недаацэнка такога курса, як дарвінізм, яго значэння ў практычнай дзейнасці глебазнаўцы-біёлага, сведчыць аб страце цікавасці да найбольш агульных установачных пытанняў, аб няправільным падыходзе некаторых студэнтаў да авалодання спецыяльнасцю.

Недастатковая зацікаўленасць у набыцці патрэбных ведаў сведчыць таксама аб прытупленні палітычнай вастрыні ў рабоце комсамольскай арганізацыі курса, якую ўзначальвае т. Ярашэвіч.

На курсе да гэтага часу няма прынцыповай крытыкі недахопаў, не вядзецца барацьба з эгаістамі, якія ставяць асабістыя інтарэсы вышэй грамадскіх, не абмяркоўваюцца пропускі студэнтамі заняткаў па няўважлівых прычынах (Голуб, Зыль) і інш.

Таму і ўся работа курса ў цэлым прадаўжае пагаршацца.

Цяпер, калі да экзаменацыйнай сесіі засталіся лічаныя дні, комсамольскай арганізацыі III курса глебавага аддзялення і факультэцкаму бюро неабходна сур'ёзна палепшыць вытворчую і палітыка-выхаваўчую работу на курсе.

Неабходна, каб комсамольскае бюро III курса ператварылася, нарэшце, з канстатара няўдач у арганізатара калектыва. Трэба павысіць адказнасць студэнтаў за вынікі вучобы ў універсітэце. Толькі пры такіх умовах курсу ўдасца пераадолець узнікшыя труднасці і паспяхова здаць экзамены зімняй сесіі.

**(Газета «За мічурынскую біялогію»).**

## УЗОРНЫ ПАРАДАК У ПАКОЯХ

З першага дня пасялення студэнтаў-першакурснікаў у інтэрнаце па вуліцы Няміга пачалася барацьба за ўзорны парадак і чыстату ў кожным студэнцкім пакоі. Тут пачала выходзіць насценгазета «За ўзорны парадак». створана група для праверкі санітарнага становішча пакояў. Вынікі праверкі заўсёды абвяшчаюцца студэнтам. У інтэрнаце арганізавана пастаяннае дзяжурства.

Заўсёды чыста і ўтульна ў пакоі № 2, дзе жывуць дзяўчаты. Хто ні прыдзе сюды, адразу-ж кідаецца ў вочы чыстата. У добрым утрыманні кватэры ёсць нейкая доля стараннай работы старасты пакоя Алы Гусевай, якая сур'ёзна змагаецца за належны парадак. Такіх чыстых пакояў у інтэрнаце нямала. Пакоі № 5 (староста Е. Васільеў), № 18 староста Л. Верына) заўсёды пры праверцы атрымліваюць таксама вышэйшыя адзнакі.

**Б. ПАЛАШУК.**



*Днямі ў пакоі адпачынку інтэрната ў корпусе «А» адбылася сустрэча студэнтаў філфака з Героем Совецкага Саюза А. В. Кірсанавым. З вялікай цікавасцю праслухалі студэнты ўспаміны А. В. Кірсанава аб гераічных подзвігах у дні Вялікай Айчыннай вайны.*

*НА ЗДЫМКУ: сустрэча студэнтаў з Героем Совецкага Саюза.*

**Фото Л. БОНДАРА.**

# Мастацкая самадзейнасць павінна быць масавай

Неяк на адным з пасяджэнняў камітэта камсамола разбіралася персанальная справа студэнткі II курса фізіка-матэматычнага факультэта В. Еськовай.

— Скажыце, калі ласка, — звярнуўся адзін з членаў камітэта да Еськовай,—якія камсамольскія даручэнні вы зараз маеце?

— Ніякіх.

— А ў мастацкай самадзейнасці ўдзельнічаеце?

— Цяпер не. На першым курсе займалася ў харэаграфічным калектыве, а ў гэтым годзе рашыла пакінуць. Вы-ж павінны разумець... Адным словам, я ўжо вышла з гэтага ўзросту. Няўжо гэта не зразумела?

Слухаючы такую заяву, можна падумаць, што Валянціне Еськовай ужо даўно пераваліла за 30 гадоў. Але не спяшайцеся рабіць вывады. Ёй толькі 18 год, і займаецца яна на другім курсе.

Нельга тут не прывесці другі прыклад. Не так даўно мы атрымалі пісьмо ад былога студэнта філалагічнага факультэта Міхаіла Корчыца. Пяць гадоў ён быў удзельнікам нашага аркестра. Цяпер ён працуе выкладчыкам сярэдняй школы. Вось што ён піша:

«Сумую па калектыву аркестра. З якім задавальненнем хадзіў-бы я зараз на рэпетыцыі, не кажучы ўжо аб выступленнях... Памятаю, як нас часамі «адчытвалі» за пропускі рэпетыцый. Як мы не мелі рацыі, калі апраўдваліся, спасылаючыся на загружанасць».

Гэтыя два прыклады ярка сведчаць аб тым, наколькі парознаму адносяцца студэнты да ўдзелу ў калектывах мастацкай самадзейнасці.

Такіх, як Валянціна Еськова, якія лічаць для сябе непрыстойным удзельнічаць у самадзейнасці, ва універсітэце нямала. Многія з іх лічаць для сябе дастатковым тое, што яны ўдзельнічалі ў мастацкай самадзейнасці яшчэ будучы піянерамі.

Камітэт камсамола, грамадскія арганізацыі універсітэта павінны больш увагі ўдзяляць развіццю мастацкай самадзейнасці. Ці можна лічыць нармальным той факт, што такія студэнты, як Фішман (фізмат), Пераверзева, Кісялёва, Барташэвіч (філфак), Прудніквава (хімфак) і іншыя прапускаюць амаль палову праводзімых рэпетыцый хору, а камсамольскія арганізацыі факультэтаў мірацца з гэтым?

У нас ёсць вялікая колькасць актыўных удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, сапраўдных энтузіястаў гэтай справы. Гэта студэнты І. Дзешко, П. Чарнуха, Л. Хількевіч, В. Шапчыц, Р. Хмыль, В. Яноўская, В. Цішкевіч, А. Лунін, А. Чэркасаў і многа іншых. У гэтых таварышаў трэба павучыцца правільна разумець неабходнасць удзелу ў рабоце мастацкай самадзейнасці і знаходзіць для гэтага час, даражыць гонарам свайго калектыву.

Вялікім недахопам у рабоце нашых самадзейных калектываў з'яўляецца таксама і тое, што ў некаторых з іх вельмі слаба пастаўлена палітыка-выхаваўчая работа. Гэта—вынік слабай увагі грамадскіх арганізацый. Ва універсітэце існуе дрэнная звычка—варта толькі каго-небудзь з удзельнікаў мастацкай самадзейнасці выбраць у камсамольскі або прафсаюзны орган, як яны адразу-ж пакідаюць калектыў мастацкай самадзейнасці. Так, напрыклад, зрабіла студэнтка III курса фізмата Н. Цярпігор'ева. Аб тым, наколькі карысным, неабходным з'яўляецца ўдзел камсамольскіх актывістаў у самадзейнасці, сведчыць прыклад гістарычнага факультэта. 12 студэнтаў гэтага факультэта ўдзельнічаюць у домра-балалаечным аркестры і сістэматычна наведваюць усе рэпетыцыі. У гэтым немалая заслуга членаў камсамольскага і прафсаюзнага бюро факультэта В. Казуцінай і Н. Скроба, якія самі ўдзельнічаюць у аркестры.

Амаль ніякай увагі не ўдзяляе наш мясцовы камітэт рабоце мастацкай самадзейнасці. З вялікай колькасці выкладчыкаў, аспірантаў і супрацоўнікаў універсітэта ў калектывах самадзейнасці ўдзельнічаюць толькі чатыры чалавекі: Л. Тамільчык, А. Рабушка, Т. Анісімава, Е Яновіч. А як-бы ўзняліся арганізаванасць, аўтарытэт калектыву, у якім прымалі-б удзел выкладчыкі! Карысным было-б у гэтых адносінах пераняць вопыт выкладчыкаў Беларускага політэхнічнага інстытута імя І. В. Сталіна.

У шматлікім калектыве універсітэцкай самадзейнасці займаецца толькі тры камуністы. Студэнт III курса гістфака камуніст Г. Аўраменка да паступлення ва універсітэт удзельнічаў, і нават кіраваў, аркестрам народных інструментаў. Але ніякія ўгаворы, ніякія перакананні не могуць прымусіць яго ўдзельнічаць у універсітэцкім аркестры. А тав. Аўраменка ніякай грамадскай работай не заняты.

Хочацца быць упэўненым, што камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў і універсітэта прымуць неабходныя меры і акажуць дапамогу праўленню клуба ва ўзняцці ўзроўню работы калектываў мастацкай самадзейнасці.

**Г. ГЕРАСІМЕНКА.**
**старшыня праўлення клуба.**

**Генадзій ЗОТАЎ.**

## *Мары*

Гарадок мой
Часта мне малюецца...
Перад ім
Цягнік прыпыніць рух,
Дзе ільны
І то нават хвалююцца
Ад дзявочых
Спрытных тваіх рук.
Мне адлегласць
Сэрца не суцішыла.
Без цябе
Я адчуваю сум.
Ты рукамі
Мне сваімі вышыла
На ўвесь век
Сузор'е светлых дум.
І здаецца:
Працаўніца ўмелая,
З таямнічай
Сінню у вачах,
Як чаромха,
Ты прыбрана ў белае—
На вяселле
Ў нас з табою шлях.
Едзем мы
Дарогамі знаёмымі,
Песні—
Для чароўнейшай з дзяўчын.
І жыццё
Для нас смяецца бомамі,
І блакітам
Вабіць далячынь...
Дык няхай
Адстукаюць калёсамі
«Та-ла-чын»
Вагоны на пуці.
Белым ранкам,
Срэбранымі росамі
Да цябе
Павінен я прыйсці.

**З апошняй пошты**

## АБ АДНЫМ „ФЕЛЬЕТОНЕ"

Рэдакцыя газеты «Слова філолага» вырашыла ўзняць пытанне аб падрыхтоўцы да экзаменаў. І вось у чарговым нумары ад 3 снежня г. г. чытаем штосьці накшталт фельетона—«Ён забыў аб прыказцы «Делу время—потехе час». Рэдакцыі не падабаецца, што студэнт II курса беларускага аддзялення Рычард Адамовіч не толькі здае экзамены на выдатна, але таксама і спартсмен, і актыўны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці універсітэта.

Газета беспадстаўна прабуе абвінаваціць Рычарда Адамовіча ў тым, быццам ён здае экзамены «штурмам».

Чыталі аднакурснікі Рычарда гэты, з дазволу сказаць, фельетон, і дзівіліся: як можна змяшчаць, хаця і ў насценнай газеце, такі галаслоўны, з неадпавядаючымі сапраўднасці фактамі матэрыял. Так, Рычард Адамовіч спартсмен і ўдзельнік мастацкай самадзейнасці, але кожнаму, хто вучыцца з Рычардам, вядома, што і вучобе ён таксама знаходзіць час. Нездарма-ж аўтар гэтага «фельетона» Кропля (ён-жа А. Падлужны) узяўся спачатку пісаць нарыс аб Рычардзе Адамовічу. Нарыс не атрымаўся.

— Дык няхай будзе фельетон!—дружна прагаласавалі члены рэдакцыі. І Кропля-Падлужны спрабуе ўжо высмеяць выступленні Рычарда на вечарах мастацкай самадзейнасці, яго заняткі спортам. «Фельетон» пачынаецца словамі: «На нашым факультэце шмат цудоўных студэнтаў».

Сапраўды, на філалагічным факультэце шмат выдатнікаў вучобы і добрых грамадскіх работнікаў, і адным з іх з'яўляецца Рычард Адамовіч. Газета «Слова філолага» няўдала выбрала аб'ект сваёй крытыкі.

**К. І. ЛУКАШОЎ.**




*ПА «УВАЖЛІВАЙ» ПРЫЧЫНЕ*

Студэнты Н. Маркін, І. Валнейка, Г. Нікалаева (II хімфак), Ю. Сапажэнкаў, В. Лашук (біяфак) спазняюцца і прапускаюць лекцыі, спасылаючыся на розныя прычыны.



*Цяжка паспець у час на заняткі калі няма рэактыўнага трамвая.*

### АД ЛІШКУ АДУКАЦЫІ

Студэнтка V курса аддзялення журналістыкі Л. Яфімцава груба адносіцца да тэхнічнага персаналу.



*— Эй, бабка! Хутчэй крэсла! Мне ў аўдыторыю! Я сёння лекцыю слухаць буду!*

### У ІНТЭРНАЦЕ



*Кухня інтэрната пасля таго, як у ёй пагаспадарылі студэнткі II курса аддзялення журналістыкі Гнедзіна і Карцава.*

ПА СЛЯДАХ МІНУЛАГОДНЯЙ КРЫТЫКІ

Аб дрэннай рабоце кубавых у інтэрнатах гаварылася яшчэ ў мінулым годзе.



**АБ'ЯВА**

*Здавайце канспекты, пісьмы, старыя заявы ў прафком і адміністратыўна-гаспадарчую частку з просьбай забяспечыць інтэрнат кіпятком, а таксама старыя галошы, біцінкі і скрынкі ад пасылак у кубавую інтэрната па вуліцы Свердлова, бо адміністрацыя не здольна даставіць туды патрэбнае паліва.*

*Сваімі сіламі дадзім студэнтам высокаякасны кіпяток!*

### ВА УНІВЕРСІТЭЦКІМ СКВЕРЫ

Ужо некалькі год ва універсітэцкім скверы, на які глядзіць акно прарэктара па адміністратыўна - гаспадарчай рабоце, стаіць вось гэтая «скульптура».



# *У СТАМБУЛЕ*

*(Працяг, пачатак у № 24 )*

У горадзе Стамбуле пераважаюць будынкі еўрапейскага тыпу. Транспарт прадстаўлен трамваямі і аўтобусамі. Ёсць таксама метро, дакладней, невялікі тунель, які злучае Перу з Галатай.

Вакол Залатога Рога многа невялікіх фабрык, майстэрняў, млыноў, складаў і крамак. У поўночнай частцы горада знаходзіцца квартал Фанар (фанарытамі называліся грэчаскія жыхары, патомкі арыстакратычных родаў і візантыйскай знаці). У свой час тут былі размешчаны дамы буйных грэчаскіх купцоў, банкіраў і ліхвяроў.

Там, дзе сёння размешчан квартал Эмінэню, у сярэднія вякі знаходзіўся будынак урада, у прасторных пакоях якога цяпер размешчаны ўстановы акругі і горада Стамбула. У гэтай частцы горада, на месцы старажытнага візантыйскага гіпадрома, размяшчаецца Ат мейдан (конскі базар)—арэна шматлікіх янычарскіх мецяжоў у сярэднія вякі і цяпер. На гэтай тэрыторыі квартала знаходзіцца таксама невялікая колькасць помнікаў выдатных сярэдневяковых візантыйскіх архітэктараў і скульптараў, а таксама сярэдневяковага турэцкага зодчаства. Выдатным будынкам з'яўляецца сабор Святой Сафіі. Да гістарычных помнікаў адносіцца гіпадром, цяпер называемы Султанскім скверам. Ён пабудаван у час Рымскай імперыі, пры Канстанціне I і быў разбуран, калі туркі захапілі горад у 1453 годзе. Ад гіпадрома засталіся толькі тры поўразбураныя калоны. Тут-жа знаходзіцца абеліск Тэадосіі, прывезены з Егіпта, а таксама Калона змей.

Захаваліся рэшткі старажытнай сцяны, якой з усіх бакоў быў абкружан горад. Яна пабудавана ў V веку і прызначана была для абароны горада ад шматлікіх ворагаў, цяпер амаль поўнасцю разбурана.

Тут знаходзіцца найвялікшае ў свеце падземнае водасховішча, якое пабудавана ў VI веку па загаду імператара Юсцініана.

З палацаў найбольш відным з'яўляецца Далмабачскі, які дзеліцца на 7 галоўных секцый, у ім налічваецца 200 пакояў.

У горадзе ёсць два універсітэты—Стамбульскі, у якім вучыцца звыш 12 тысяч студэнтаў, і Тэхнічны універсітэт. У апошнім займаецца 2600 студэнтаў.

Ёсць таксама універсітэт у Анкары. Гэтыя універсітэты—амаль адзіныя навучальныя ўстановы ў Турцыі.

Турэцкі камітэт канферэнцыі арганізаваў таксама экскурсіі па Басфору і Мрамарным моры ў г. Бурсу.

Басфор уяўляе сабой праліў даўжынёй у 29 кіламетраў. Найбольшая шырыня яго 3,3 кілометра. Самае вузкае месца знаходзіцца паміж Румеліхісарам і Анадалухісарам—700 метраў.

Мрамарнае мора нагадвае вялікі вадаём у форме эліпса, даўжыня якога 200 кіламетраў і шырыня каля 85. Мора мае некалькі такіх буйных заліваў, як Ізміцкі, Гемлікскі і інш. Яго глыбіня месцамі дасягае 1200 метраў. Берагі высокія, крутыя, часамі гарыстыя.

...Сучасная Бурса знаходзіцца на месцы старажытнай Прусы, заснаванай у 184 годзе да нашай эры. Яна налічвае каля 130 тысяч жыхароў і, паводле турэцкага маштаба, з'яўляецца буйным прамысловым і гандлёвым цэнтрам. Гэта тыповы ўсходні горад з вузкімі крывымі вуліцамі, значную частку якіх займаюць шматлікія алеі высокіх цёмназялёных кіпарысаў і таполяў. Горад славіцца сваімі выдатнымі крыніцамі і сернымі ваннамі. Тут ёсць фабрыкі: шаўковая, тэкстыльная, прадзільныя і інш. Працуюць прадпрыемствы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны, развіты саматужны выраб прадметаў шырокага ўжытку.

Бурса—адзін з курортаў Турцыі. Сюды, на мінеральныя воды, штогод прыязджае вялікая колькасць хворых. Заўсёды тут многа турыстаў. Для іх абслугоўвання пабудавана вялікая гасцініца, якая рэкламуецца самай лепшай на ўсім Бліжнім Усходзе.

У Мрамарным моры (непадалёк ад Стамбула) размешчаны Прынцавы астравы. У іх складзе—9 невялікіх астраўкоў. Раней яны называліся Прыест (свяшчэннымі) астравамі. У перыяд упадку Візантыйскай імперыі манастыры і канвенты выкарыстоўвалі іх, як месца для пакарання прынцаў і прынцэс, адхіленых ад трона, у выніку чаго яны атрымалі назву Прынцавых астравоў. Зараз яны з'яўляюцца курортным месцам для знаці. На адным з астравоў размешчана марская ваенная школа.

*(Працяг будзе)*

